УДК 392.51-053.81(=161.3):115

# Этнанацыянальныя асаблівасці асэнсавання часу святкавання вяселляў беларускай моладзі: традыцыйны і сучасны кантэксты

# Ethno-national peculiarities of the Belarusian youth wedding celebration time comprehension: traditional and modern contexts



**А. В. Катовіч,** *магістр педагагічных навук, ст. выкладчык кафедры рэжысуры,*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў*

**A. V. Kotovich,** *master of pedagogical Sciences, B. teacher of the Department of directing,*
*Belarusian state University of culture and arts*

*В предложенной статье рассматриваются социокультурные и космопланетарные детерминанты, которые влияли на формирование структуры народно-христианского календаря и, соответственно, предопределяли условия решения стратегических вопросов сохранения, расширения и продолжения своего рода. Отмечен широкий круг разноуровневых социокультурных факторов, которые также ограничивали или, наоборот, способствовали проведению народных свадеб.*
*Ключевые слова: время, регламентация, свадьба, система, социум, ценность.*

*The article deals with socio-cultural and cosmoplanetary determinants that influenced the formation of the structure of the people's Christian calendar and, accordingly, predetermined the conditions for solving strategic issues of preservation, expansion and continuation of its kind. A wide range of different levels of socio-cultural factors that also limited or, conversely, contributed to the holding of folk weddings.*
*Key words: time, regulation, wedding, system, society, value.*

Канцэпт захавання і працягу свайго роду меў надзвычайную актуальнасць ва ўсе часы існавання патрыярхальнага соцыума. Ён факусіраваў у сабе даволі шырокі спектр сацыякультурных дэтэрмінантаў: пачынаючы ад статуснага цэнзу бацькоў жаніха і нявесты (іх родавая суаднесенасць), становішча, якое яны займаюць у каштоўнаснай іерархіі вясковай абшчыны, і заканчваючы прадпісаннямі царквы або касцёла, а таксама паэтапнае ўключэнне юнакоў і дзяўчат перадшлюбнага ўзросту ў сацыянарматыўнае поле вясельных традыцый. Падрыхтоўка і правядзенне вяселляў як аднаго з фундаментальных крытэрыяў «моладзевай палітыкі» соцыуму мела дакладна распрацаваны кодэкс этнакультурных прыярытэтаў. Гісторыя існавання гэтага кодэкса ў XX ст. мела даволі складаны лёс, на які аказваў непасрэдны ўплыў характар ўзаемаадносін дзяржавы і царквы. Менавіта таму ў апошняй чвэрці мінулага стагоддзя (і перш за ўсё ў гарадскім асяроддзі) сацыянарматыўнае поле моладзевых вяселляў набыло характар аморфнасці і хаатычнасці. Аднак тыя змены, якія прывялі да фарміравання самастойнай Беларусі, да аднаўлення сацыяльнага і духоўнага статуса царквы, выклікалі і запатрабаванасць у вяртанні традыцыйных этнакультурных каштоўнасцей. У сувязі з гэтым прапаноўваецца сістэмны погляд на асэнсаванне часу святкавання вяселляў з улікам шматвяковых традыцый беларускага народа.

Аксіялогія сацыякультурных аспектаў гэтага кодэкса мела арганічную суаднесенасць вяселляў з дэталёва распрацаванай сістэмай каштоўнасных характарыстык катэгорыі часу. У даным выпадку мы лічым апраўданым выкарыстанне паняцця сістэмнасці ў дачыненні да асэнсавання параметраў часу, таму што яно канцэнтруе вакол сябе не толькі сацыякультурную маркіроўку часавых дэтэрмінантаў, але і іх прыродна-касмічную сузалежнасць. Менавіта сістэмнае асэнсаванне катэгорыі часу праз прызму агульнародавай мэтазгоднасці дазваляе ўбачыць каштоўнасную шматслойнасць часавай абумоўленасці і выявіць тыя характарыстыкі, якія раскрываюць рознаўзроўневыя стасункі часавай інтэрферэнцыі.

Праблема асэнсавання традыцыйных уяўленняў аб часе патрабуе вырашэння фундаментальнага пытання: вызначэнне якасных характарыстык часу у структуры касмічна абумоўленых цыклаў (суткі, тыдзень, месяц, год) і яго акцэнтаваная дыскрэтнасць на вектары лінейнага разгортвання. Вядомы філасаф культуры М. Эліадэ падзяляе плынь часу на прафанныя і сакральныя адрэзкі [18]. Этналінгвіст Т. Б. Шчапанская ў даследаванні, прысвечаным культуры дарогі, адзначае, што айкумена этнічнага існавання палярызавана па прынцыпе станоўчага і негатыўнага стаўлення да яе чалавека. Даследчык вылучае шэраг локусаў, надзеленых сакральным статусам: святыя мясціны, аброчныя крыжы, святыя крыніцы, культавыя камяні [17, с. 244–317]. Адпаведна сакральным локусам супрацьпастаўляюцца «гіблым» мясцінам. Гэты аспект з'яўляецца адным з найважнейшых у паэтыцы замоў, якія адсылаюць хваробу «*туды, дзе пеўні не пяюць, дзе сабакі не брэшуць*». Калі ўлічыць той метадалагічны аспект, што ў філасофіі культуры катэгорыя часу разглядаецца ў непасрэднай сувязі з катэгорыяй прасторы, то можна небеспадстаўна разглядаць прастору як крытэрый часавай аксіялогіі і наадварот, катэгорыю часу асэнсоўваць праз якасныя характарыстыкі прасторы. У такім разе апазіцыя *сакральнага і прафаннага* можа быць цалкам перанесена на якасныя характарыстыкі часу, што пацвярджаецца вялікім факталагічным матэрыялам міфапаэтычнай спадчыны беларусаў.

У дачыненні да сістэмы парадкавання часу прынцып структурнага процістаяння добрага і кепскага часу [14, с. 94–95] мае у свядомасці чалавека надзвычайны статус. Найбольш пераканаўча аб гэтым сведчаць падарожныя замовы. Той, хто збіраўся ў дарогу, «абгароджваў» і адначасова «адгароджваў» сябе ад усяго навакольля, напрыклад: «*Іду я ў дарогу, Гасподзь Бог са мною. Мацер Божая перад глазамі, Ісус Хрыстос за плячамі, з бакоў ангелы мяне ахраняюць – усю бяду ад мяне адганяюць*». Тыя, хто праводзіў чалавека, прамаўлялі пажаданне або зычэнне: «*Дай, Божа, у добры час!*»

У кантэксце вясельнага абраду традыцыйнае рытуалізаванае зычэнне надзялялася статусам сакралізаванага благаслаўлення: «*Дай, Божа, у* ***добры час пачаць***, *// У* ***злы – памаўчаць****! // Родныя бацька і маці! // Станьце на пасаці, // Дайце благаславенне свайму дзіцяці!*». Дэклараванне гэтага абрадавага імператыву актуалізавалася ў кантэксце вяселля неаднаразова, напрыклад, калі распачыналі прыгатаванне або дзяльбу каравая: «*Зачынай у* ***Божы час****, як у людзей, так і ў нас!*» [4, с. 133, 291].

Зычэнне «*У добры час*!» мела шырокі спектр абрадавых кантэкстаў. У пэўнай ступені яно перагуквалася з сімволікай пачатку і часам, прымеркаваным да гэтай пары. Такое пажаданне абавязкова суправаджала пачатак сяўбы, распачынанне жніва, першы выган хатняй жывёлы на пашу. *Добры час,* або *добрая пара,* паступова станавіліся тым рытуальным эпіцэнтрам, вакол якога сфарміравалася значная колькасць перасцярог, абмежаванняў, рэгламентацый і г. д. У сувязі з адсутнасцю дакладнага рэестра хвілін або гадзін у структуры сутак з аксіялагічнай дамінантай *добры,* можна выказаць меркаванне, што фактычна любая часавая кропка магла мець спрыяльны для чалавека характар пры ўмове яе сакралізацыі пры дапамозе выканання адпаведных рытуалаў і прамаўлення магічных вярбальных формул.

*Ня ўрэмя* – яшчэ адзін этналінгвістычны крытэрый часу, які ў процівагу папярэдняму адзначае яго неспрыяльнасць у дачыненні да чалавека. У вясельнай песні, зафіксаванай намі ў в. Ляды Дубровенскага раёна, падаецца наступная канстатацыя неспрыяльнага часу шлюбавін

*«А ў тым дворыку дзеўка хараша... // Танюшэнька-душанька, аткрой варата... // Ванюшэнька-дружочык,* ***не ўрэмя тваё // Эй, не ўрэмя тваё*** *// Ой не ўрэмюшка тваё, не шчасце маё // Эй, не шчасце маё».*

Гарызонты асацыятыўнага поля значна пашырацца, а характарыстыка ўскладніцца, калі мы паспрабуем разгледзець самы **адказны этап у жыцці моладзі – час правядзення вяселля** ў сістэме каардынат, трэба толькі вызначыць, што будзе пакладзена ў яе аснову: сонечны ці месяцовы рух, лічбавы код каляндарнага года, рэлігійныя вераванні і г. д.

У асяроддзі беларусаў існаваў фразеалагізм, які дакладна вызначаў каляндарную суаднесенасць вядомых сямейна-родавых абрадаў: ***«Смерць і радзіны не выбіраюць гадзіны».*** У такім разе час для выканання вясельных абрадаў неабходна было выбіраць, улічваючы шэраг сацыякультурных і касмапланетарных і фактараў.

***«У памінальны год вяселляў не спраўляюць».*** У асяроддзі беларусаў існавала шматузроўневая сістэма абмежаванняў на правядзенне вяселляў. Адным з важных стрымліваючых фактараў з'яўлялася смерць бацькоў або каго-небудзь з блізкіх родных жаніха або нявесты. У традыцыйным светапоглядзе народа пахавальны абрад быў надзелены самым высокім культурным статусам. Яго значнасць была настолькі вялікай, што магла карэктаваць, пераносіць на другі час або ўвогуле адмяняць усе іншыя абрадавыя практыкі і этыкетныя рэгламентацыі соцыума. Актуалізацыя рытуальна-абрадавага комплекса і падзея, якую ён суправаджаў, прыпынялі/разрывалі плынь каляндарнага часу (першае рытуальнае дзеянне, якое здзяйсняюць пасля смерці чалавека, – спыняюць гадзіннік) і запускалі механізм дзеяння зусім іншага прынцыпу яго парадкавання і злічэння. Такая **сям'я пераходзіць у прастору дзеяння пахавальна-памінальнага цыклу абрадаў, працягласцю адзін год** [10, с. 109–114]. І толькі пасля таго як радзіна адзначыць «угодкі» – апошні памінальны стол, будзе адноўлены ход насценнага гадзінніка, і, адпаведна, сям'я зможа вярнуцца да падрыхтоўкі і правядзення вяселля.

***«Абы добрая гадзіна, то знойдзецца і радзіна».*** У традыцыйным народным светапоглядзе існуе сістэма парадкавання часу, у якой разам зліліся дзве шматвяковыя традыцыі: дахрысціянская, народная і больш позняя па часе прыняцця і пашырэння – хрысціянская. Працэс суіснавання і ўзаемазбліжэння разгортваўся на розных узроўнях. Аднак пры гэтым неабходна адзначыць, што архічная традыцыя захавала свае кола дамінантных крытэрыяў, якія ўплывалі на характар парадкавання каляндарнага часу і яго структурную сегментацыю ў залежнасці ад пораў года і характару земляробчых спраў [10, с. 36–132].

Галоўным структураўтваральным элементам традыцыйнага народнага календара славян быў рух Сонца па небасхіле. У сваім гадавым колазвароце яно праходзіць чатыры фазы са своеасаблівай кропкай адліку, кожнай з якіх у народным жыцці і народным календары адпавядаў шматдзённы рытуальна-абрадавы комплекс. Народная традыцыя **забараняла праводзіць вяселлі ў дні,** якія маркіравалі важныя пераходныя перыяды: **летняга і зімовага сонцаваротаў, веснавага і восеньскага раўнадзенстваў, а таксама на стыку змяняемых пораў года.** У гэтыя дні святкавалі вялікія гадавыя святы беларускага народнага календара: Каляды, Масленіцу, Сёмуху, Купалле, Жніво, Багач і інш. Забаранялася святкаваць вяселле і напярэдадні «радзіцельскіх» дзён – Восеньскіх Дзядоў, у суботу перад Масленіцай, Тройцай: «Калі браць шлюб напярэдадні памінальнай суботы..., то гэта азначае, што маладыя не будуць мець шчасця» [8, с. 208].

Асабліва строгія забароны тычылася пачатку новага года. У ноч з 24 на 25 снежня Сонца паварочвае «на лета», таму да гэтага дня быў прымеркаваны пачатак Каляд – аднаго з найбольш старажытных святаў, якое доўжылася два тыдні і маркіравалася трыма абрадавымі «кропкамі», якія ў асяроддзі беларусаў атрымалі назву *Куцця* (па назве асноўнай абрадавай стравы). Вечары ад першай Куцці і да Вадохрышча былі надзелены негатыўнымі рысамі. Іх назвалі крывымі, «*варавітымі*», лічылася, што ў гэты час спраўляліся «звярыныя» або «птушыныя» вяселлі: «на Каляды толькі ваўкі жэняцца» [7, с. 551; 9, с. 427]. На працягу святкавання Каляд дзяўчатам дазвалялася «зазірнуць» ў кнігу Вечнасці – варажыць на суджанага. Спраўляць вяселлі пачыналі адразу пасля Вадохрышча. «*Крэст у воду – дзеўкі ў моду*», – гаварылі ў Рэчыцкім раёне.

У той жа час менавіта на Каляды, паміж першай і другой Куццёй, у беларускіх вёсках выконвалі абрад «Жаніцьба Цярэшкі», у якім удзельнічала нежанатая моладзь. Гэты абрад-гульня служыў своеасаблівай падрыхтоўкай да будучага сватаўства і шлюбу.

***«Расце Луна, расцем і мы»,*** – у народных касмаганічных уяўленнях Сонца і Месяц надзяляліся рысамі чалавека і нават удакладнялася ступень іх сваяцтва, часцей за ўсё іх называлі мужам і жонкай: *«А я дзеўка добрая, // Бацькі багатага. // Мой бацька – ясны месяц, // Мая маці – краснае сонейка… // Ясны месяц усю ноч свеціць, // Краснае сонейка ўвесь дзень грэіць…//* (купальская), радзей – братам і сястрой: *«Сястра да брата ў госці ідзе, а брат ад яе хаваецца»* [13, с. 38–39]. Сэнс гэтай загадкі раскрывае легенда пра тое, што калісьці Сонца і Месяц былі братам і сястрой, якіх разлучылі злыя сілы. Калі юнак і дзяўчына сустрэліся зноў, то пакахалі адзін аднаго. Маці прыйшлося прызнацца ў тым, што яны родныя адзін аднаму, і шлюб не атрымаўся. «З тых часоў бяжыць Месяц ад Сонца, як толькі ўбачыць яго на гарызонце…» Гэта легенда захавала ў сабе забарону на інцэст – шлюб паміж братам і сястрой [1, с. 418–420].

У былыя часы у храмах жаніх заручаўся залатым пярсцёнкам, а нявеста – срэбным, што адпавядала старажытным уяўленням пра саюз Сонца і Месяца. «Залаты пярсцёнак сваім залатым бляскам сімвалізуе Сонца, святлу якога прыпадабняецца муж у шлюбным саюзе; срэбнае – падабенства Месяца – меншага свяціла, якое зіхаціць, азоранае сонечным святлом», – адзначаецца ў зборы царкоўных правілаў «Нашы традыцыі: хрышчэнне, шлюб, пасты» [11, з. 120].

У народнай касмагоніі існавала падрабязная дэталізацыя адносін да фазаў Месяца і былі вызначаны прыярытэты паводзін, правядзення тых або іншых відаў працы, а таксама выпрацаваны забароны і рэгламентацыі сацыякультурнай накіраванасці. Так, усе справы, арыентаваныя на працяг роду, пашырэнне дабрабыту, пачатак будаўніцтва хаты, уваходзіны і г. д., неабходна выконваць на «мужчынскі» Месяц – «маладзік» і ніколі не рабіць у «жаночую» Поўню: «… дом строиць, так строили ў старом. Коли ў старом, так усё будзе добрэ и дом доўго стояць и крэпки»; «Уходзины ў хату дзелали ў первую нядзелю маладзика» [15, с. 136].

Месяц, як меркавалі нашы продкі, аказваў моцны ўплыў на лёс чалавека. Мадэляванне асноў чалавечай светабудовы было суаднесена з «прылівамі» і «адлівамі» касмічнага і планетарнага характару: калі «прыбывае» на Нябёсах, значыцца, павінна прыбываць і ў жыцці або гаспадарчай дзейнасці чалавека. Менавіта таму найбольш **аптымальны тэрмін для правядзення вясельных абрадаў** (сватаўства, заручын і ўласна вяселля) лічыўся той **час, калі Месяц расце,** асабліва на дні, максімальна набліжаныя да поўні [6, с. 475].

***«У пост будзеш жонку браць – ваўкі ўкрадуць».*** Адной з складовых частак хрысціянскага календара з'яўляюцца **пасты, падчас якіх вяселлі не спраўляліся.** Неабходна адзначыць, што падчас паста на паводзіны людзей накладваўся даволі шырокі спектр абмежаванняў: «У гэты час елі не часцей двух разоў у дзень, не спявалі свецкіх песень (а толькі псалмы і духоўныя вершы), распавядалі выключна павучальныя казкі, не сварыліся паміж сабой, мужыкі не пілі гарэлку, забаранялася забіваць скаціну. Падчас паста катэгарычна забараняліся сэксуальныя адносіны, не гулялі вяселляў і нават не сваталіся» [2, с. 203]; «У пост не спiвалі, у пост кальца не насі, спяваць не будзеш, гармошка не іграе»; «У пост (Піліпаўкі, Вялікодны, Пятроўскі, Спасаўскі) ніколі не гулялі» [15, с. 185].

Вядома, жыццё немагчыма падагнаць пад усе правілы. У некаторых выпадках трэба было шукаць кампраміс: «У Мазовшэ, калі нявеста была цяжарная, а яе жаніха неўзабаве павінны былі забраць у войска, ксёндз меў права павянчаць іх у дзень святога Іосіфа (не гледзячы на пост). Шумнага вяселля ў такім разе не ўладкоўвалі, аднак падобныя шлюбы, выкананыя непасрэдна пад патранажам святога Іосіфа, лічыліся шчаслівымі». А сярод заходніх беларусаў пра такія шлюбы ўсё ж казалі з доляй іроніі і недаверу: «*Святы Язэп сярод посту шлюб дае прахвосту!*» [2, с. 203].

***«Хто ў маі ажэніцца, той усё жыццё маяцца будзе»*** – у парэміялагічным корпусе беларускага фальклору захаваўся фразеалагізм, які сведчыць пра стрыманае або нават негатыўнае стаўленне народа да вяселляў у маі. З усіх месяцаў «юліянскага»

года май атрымаў у славянскай традыцыі негатыўную афарбоўку і ўспрымаецца як цяжкі, нешчаслівы час. «Нашы чадалюбівыя старыя з 30 красавіка ... спынялі ўсякае сватаўство. Па іх паняццях, надыходзячы май месяц вельмі невыгодны бывае для маладых. Усякая прапанова пра сватаўство лічылася справай крыўднай і нават ганебнай», – адзначае І. П. Сахараў (Народны каляндар. Святы і звычаі, 1885 г.) [19, с. 251].

Такое стаўленне да мая можна растлумачыць не толькі гукавым падабенствам назвы месяца са словам, якое вызначае незадаволенасць становішчам, – маяцца або мучыцца. У вясковым асяроддзі канец красавіка, май і пачатак чэрвеня былі для селяніна, бадай што, самымі адказнымі ва ўсім каляндарным цыкле гаспадарчай дзейнасці – праводзілася сяўба яравых культур, ад якой залежаў будучы ўраджай: «З другога боку, і бацькі не аддадуць дзеўку замуж вясною, таму што гэта азначала перад самым пачаткам цяжкіх летніх прац адпусціць з хаты дармовую працаўніцу», – піша В. Ю. Лешчанка. «Сям'я і рускае Праваслаўе» [12, с. 109]. М. М. Сумцоў у манаграфіі «Пра вясельныя абрады, пераважна рускіх» піша:»...прычыну няшчаснага значэння мая бачаць у тым, што для баб пачынаюцца цяжкія працы пры недахопе ежы... Народ не баіцца працы; ён не гэтулькі шануе бяздзейнасць, каб лічыць шчаслівым таго, хто жэніцца ў бяздзейны час» [13, с. 58].

***«Год удавы».*** Кожны чацвёрты год сучаснага календара лічыцца высакосным. Яго няўстойлівасць, зменлівасць, рухомасць паслужыла падставай для фарміравання негатыўных адносін да гэтага феномену каляндарнага летазлічэння: «Здаўна заведзена на Русі лічыць высакосны год небяспечным і прыпісваць яму шматлікія небывалыя беды. 29 лютага высакоснага года ёсць самы бядотны дзень для ўсіх магчымых няшчасцяў. Тады, быццам, і скацінаваліцца, і дрэва засыхаюць, і павальныя хваробы з'яўляюцца, і сямейныя разлады заводзяцца» [19, с. 63]. Высакосны год уносіў істотныя карэктывы і ва ўстойлівы рытм сямейнага жыцця. Менавіта яго народная свядомасць ахрысціла «ўдовіным» годам. І таму ў гэты час не раілі спалучацца шлюбам, бо ўжо сам час мог стаць прычынай хуткай адзіноты [5, с. 294].

Вылучэнне рознага роду абмежаванняў, якія забаранялі святкаванне вяселляў, дазволіць нам, нарэшце, вызначыць найбольш аптымальныя тэрміны іх правядзення, а таксама адзначыць фактары, якія варта было ўлічваць пры гэтым. **Адным з найбольш спрыяльных перыядаў з'яўляецца час ад канца жніўня і да пачатку Піліпаўскага посту** (28.11). Выключэннем будзе памінальны дзень – Дзімітрыеўскія Дзяды (субота напярэдадні 08.11, дзень ушанавання святых Дзмітрыя Салунскага і Дзмітрыя Данскога). **Асабліва шчаслівымі лічыліся шлюбы, якія прыпадалі адразу пасля свята Пакроў Багародзіцы** (14.10): *«Бацька Пакроў, пакрый маці-сыру зямлю сняжком, а меня жанішком»; «Прыйдзе Пакроў, дзеўцы галаву пакрые»* ( г. зн. надзене вэлюм). Гэты невялікі прамежак часу – з 14.10 па 27.11 – атрымаў назву *Вялікая вясельніца,* таму што на яго прыпадала самая вялікая колькасць вяселляў. Вось што адзначаў з нагоды выбару дня вяселля вядомы фалькларыст Я. Ласіцкі у артыкуле «Вясельныя абрады вясковага люду ў Мінскай губерні...»: «Пра шлюбныя сувязі тут сяляне звычайна пачынаюць клапаціцца з першых дзён кастрычніка. У іншую пару да гэтага іх змушаюць хіба толькі пільная гаспадарчая патрэба ці якія-небудзь непрадбачаныя акалічнасці. Калі ў мужа і жонкі, якія пажаніліся «не ў пару», узнікаюць потым сямейныя нелады ці іншыя нечаканасці, гэта прыпісваюць адступленню ад агульнага звычаю. Лічыцца, што самы спрыяльны для шлюбу час – паміж Пакровам і першай нядзеляй Каляднага посту» [4, с. 39].

**Другім спрыяльным часам для святкавання вяселляў быў *Зімовы Мясаед*, які пачынаўся 21 студзеня і заканчваўся напярэдадні Масленіцы** (г. зн. за восем тыдняў да Вялікадня). П. В. Шейн прыводзіць паведамленне аднаго з карэспандэнтаў, які зафіксаваў назвы найбольш спрыяльных перыядаў правядзення вяселляў сярод беларускага насельніцтва: «Ад Пакрова да запускаў (г.зн. пачатку Піліпаўскага паста) – вялікая свадзебніца і ад Вадохрышча да Вялікага паста – малая свадзебніца» [16, с. 67].

У структуры народнага календара ёсць яшчэ адзін невялікі па часе перыяд, на працягу якога дапускалася ладзіць вяселлі. Ён пачынаўся напярэдадні Сёмухі і заканчваўся перад Пятроўскім пастом –

так званыя *Траецкія вяселлі*. Але да вяснова-летніх вяселляў заўсёды было даволі стрыманае стаўленне. Квінтэсенцыя негатыўных адносін адлюстравана ў наступным фразеалагізме: *«Як бедламу жаніцца, так і ноч кароткая»* [10, с. 36–132].

Такім чынам, ва ўзаемаадносінах космапланетарных і сацыякультурных характарыстык часу і каштоўнасных прыярытэтаў рытуальна-абрадавага комплексу беларускага вяселля існавалі складаныя іерархічныя стасункі. Сістэма парадкавання каляндаранага часу ўтрымлівала ў сабе сегменты, якія забаранялі або прыпынялі магчымасць святкавання традыцыйных вяселляў, і акрэслівалі найбольш спрыяльныя адрэзкі часу, якія дазвалялі беларускаму традыцыйнаму грамадству вырашаць пытанні, звязаныя з захаваннем і працягам свайго роду.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. *Агапкина, Т. А.* Инцест / Т. А. Агапкина // Славянские древности: Этнолингвистический словарь: в 5 т. / под общ. ред. Н. И. Толстого. – М.: Междунар. отношения, 1999. – 704 с. – Т. 2: Д – К (Крошки). – С. 418–420.
2. *Агапкина, Т. А.* Пост / Т. А Агапкина // Славянские древности: Этнолингвистический словарь: в 5 т. / под общ. ред. Н. И. Толстого. – М.: Междунар. отношения, 2009. – Т. 4: П (Переправа через дорогу) – С (Сито). – С. 202–206.
3. *Бернштам, Т. А.* Молодость в символизме переходных обрядов восточных славян: Учение и опыт Церкви в народном христианстве / Т. А. Бернштам. – СПб.: Петербургское Востоковедение, 2000. – 400 с.
4. Вяселле: Абрад / уклад., уступ. арт. і камент. К. А. Цвіркі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1978. – 640 с.
5. *Гура, А. В.* Вдовство / А. В. Гура, Г. И. Кабакова // Славянские древности: Этнолингвистический словарь: в 5 т. / под общ. ред. Н. И. Толстого. – М: Междунар. отношения, 1995. – 584 с. – Т. 1: А – Г. – М.: С. 293 – 297.
6. *Гура, А. В.* Обручение / А. В. Гура // Славянские древности: Этнолингвистический словарь: в 5 т. / под общ. ред. Н. И. Толстого. – М.: Междунар. отношения, 2004. – 704 с. – Т. 3: К (Круг) – П (Перепелка). – С. 471–475.
7. *Гура, А. В.* Свадьба животных / А. В. Гура // Славянские древности: Этнолингвистический словарь: в 5 т. / под общ. ред. Н. И. Толстого. – М.: Междунар. отношения, 2009. – 649 с. – Т. 4: П (Переправа через воду) – С (Сито). – С. 551–552.
8. Земляробчы каляндар: абрады і звычаі / уклад., класіф., сістэм. матэр. і камент. А. І. Гурскага; уступ. арт. А. І. Гурскага, А. С. Ліса (Бел. нар. творчасць). – Мінск: Навука і тэхніка, 1990. – 405 с.
9. *Кабакова, Г. И.* Волчьи дни / Г. И. Кабакова // Славянские древности: Этнолингвистический словарь: в 5 т. / под общ. ред. Н. И. Толстого. – М: Междунар. отношения, 1995. – 584 с. – Т. 1: А – Г. – М.: С. 427–428.
10. *Котович, О. В.* Белорусская свадьба в пространстве традиционной культуры / О. В. Котович, И. И. Крук. – Минск: Адукацыя і выхаванне, 2012. – 848 с.
11. Крещение. Венчание. Погребение. Посты (Наши традиции). – М.: Букмен, 1998. – 384 с.
12. *Лещенко, В. Ю.* Семья и русское православие / В. Ю. Лещенко. – СПб.: Издательство Фроловой Т. В., 1999. – 394 с.
13. *Сумцов, Н. Ф.* Символика славянских обрядов: Избранные труды / Н. Ф. Сумцов. – М.: Издательская фирма «Восточная литература» РАН, 1996. – 296 с.
14. *Толстая, С. М.* Дни добрые и злые / С. М. Толстая // Славянские древности: этнолингв. словарь: в 5 т. / под общ. ред. Н. И. Толстого. – Т. 2: Д–К (Крошки). – М.: Междунар. отношения, 1999. – С. 94–95.
15. *Толстая, С. М.* Полесский народный календарь / С. М. Толстая. – М.: Индрик, 2000. – 600 с.
16. *Шейн, П. В.* Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края : Сборник Отделения рус. языка и словесности Имп. Акад. наук: в 3 т., 1887–1902 / П. В. Шейн // Т. I. Ч. 2: Бытовая и семейная жизнь белорусов в обрядах и песнях. – СПб.: Тип. имп. Акад. наук, 1890. – 712 с.
17. *Щепанская, Т. Б.* Культура дороги в русской мифоритуальной традиции XIX– XX вв. / Т. Б. Щепанская. – М.: Индрик, 2003. – 528 с.
18. *Элиаде, М.* Священное и мирское / М. Элиаде; пер. с фр., предисл. и коммент. Н. К. Горбовского. – М.: Изд-во МГУ, 1994. – 144 с.
19. Энциклопедия суеверий. – М.: Миф, Локид, 1995. – 560 с.


*Дата падачы: 17.01.2019.*